# Майстар-клас «Ментальная карта ў рабоце з вучнямі з інтэлектуальнай недастатковасцю»

**А. А. Карпенка,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
Ціхініцкай СШ імя А. А. Осіпава

**Мэта майстар-класа:** плануецца, што ўдзельнікі авалодаюць ведамі пра ментальную карту як сродак развіцця камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў.

**Задачы:**

- стварыць умовы для павышэння матывацыі ўдзельнікаў майстар-класа;
- садзейнічаць развіццю навыкаў распрацоўкі ментальных карт;
- стварыць умовы для самарэалізацыі педагогаў і стымулявання іх прафесійнага росту.

## Ход майстар-класа

### I. Арганізацыйна-матывацыйны этап

*Задачы:* стварыць спрыяльную абстаноўку, арганізаваць увагу педагогаў, сфарміраваць групы па 4–5 чалавек.

*Майстар вітае ўдзельнікаў, паказвае ім магнітны пазл і прапануе адказаць на пытанні:*

- ✓ Ці нагадвае гэты пазл завершаную структуру?
- ✓ А калі я вазьму дэталі з іншага набору, ці калі я пастаўлю іх не ў той паслядоўнасці, ці некалькі элементаў нават прыбяру, атрымаецца ў мяне завершаная кампазіцыя?
- ✓ Атрымліваецца, калі мы жадаем атрымаць вынік, у тым ліку і рэзультат ад нашых вучняў, то мы павінны навучыць іх бачыць узаемасувязь з'яў і пэўную цэльнасць.
- ✓ Як называецца звязнае і адносна завершанае выказванне на пэўную тэму, якое складаецца з групы сказаў, аб'яднаных сэнсам і граматычна?
- ✓ Ці лёгка нашым вучням ствараць тэксты на беларускай мове? Чаму?
- ✓ Для чаго ствараюцца тэксты?

**Майстар.** Асноўная мэта стварэння тэкстаў – камунікатыўная. Вядома, што тэкст – гэта аснова для разіцця камунікатыўных навыкаў. Таму, калі я хачу, каб мае вучні размаўлялі па-беларуску, то я павінна вучыць іх, як правільна ствараць тэксты. Адным з эфектыўных спосабаў развіцця камунікатыўных навыкаў вучняў, на маю думку, з'яўляецца выкарыстанне ментальных карт.

*Майстар называе тэму майстар-класа, яго мэту і задачы.*

### II. Інфармацыйна-дзейнасны этап

*Задача:* удакладніць веды пра ментальную карту.

Прыём «Інсерт». Прачытайце прапанаваныя выказванні і абазначце графічна насупраць кожнага выказвання:

- ✓ вядомая інфармацыя – знак «+»,
- ✓ новая – знак «!»,
- ✓ незразумелая – знак «?»,
- ✓ я думаў па-іншаму – знак «–».

| № | Выказванне | Графічны знак |
|---|---|---|
| 1 | Ментальная карта – гэта спосаб перадачы інфармацыі ў графічным выглядзе | |
| 2 | Сутнасць заключаецца ў выдзяленні галоўнага паняцця, ад якога залежаць галіны другога парадку | |
| 3 | З дапамогай ментальнай карты можна спыняцца на важных дэталях, бачыць сэнсавыя вобразы | |
| 4 | Для стварэння ментальных карт выкарыстоўваюцца толькі рознакаляровыя алоўкі | |
| 5 | Асноўная ідэя, праблема ці ключавое слова размяшчаецца ў цэнтры | |
| 6 | Галоўныя галіны злучаюцца з цэнтральнай ідэяй, а галіны другога, трэцяга парадку злучаюцца з галоўнымі галінамі | |
| 7 | Для выявы цэнтральнай ідэі можна выкарыстоўваць малюнкі | |

**III. Этап адпрацоўкі ўменняў і навыкаў**

***Задачы:*** стварыць умовы для працы ў групах; матываваць удзельнікаў на свабодны абмен меркаваннямі.

**Майстар.** Ментальныя карты я выкарыстоўваю на розных этапах урока: пры пераказе мастацкага тэксту, пры знаёмстве з біяграфічнымі звесткамі, пры характарыстыцы герояў.

Мы зараз папрацуем у групах. У старэйшых класах перад знаёмствам з творам мы павінны азнаёміцца з біяграфічнымі звесткамі. Але нашым вучням складана запамінаць уласныя назвы, назвы геаграфічных аб'ектаў, назвы твораў, таму мы і выкарыстоўваем ментальную карту як апору.

***Заданні групам***

Група 1. Прачытайце біяграфічныя звесткі пра Максіма Танка і пры дапамозе ментальнай карты стварыце звязны тэкст.

**МАКСІМ ТАНК**

*(Яўген Іванавіч Скурко, 1912—1995)*

Імя Максіма Танка — адно з самых яркіх у гісторыі беларускай літаратуры. Паэт-патрыёт, паэт-філосаф, паэт-наватар…

Нарадзіўся Яўген Іванавіч Скурко на Міншчыне ў вёсцы Пількаўшчына. На яго лёс прыпалі многія гістарычныя падзеі – і падзел Беларусі на Усходнюю і Заходнюю, і Першая сусветная вайна, і рэвалюцыя, і Другая сусветная вайна. Паэту давялося спазнаць шмат цяжкасцей, змяніць многа месцаў жыхарства, пабыць у няволі. Але ў Максіма Танка быў моцны характар і цвёрдая ўпэўненасць у лепшай будучыні.

Максім Танк – сапраўдны майстар пейзажу. Яго паэзія прасякнута глыбокім адчуваннем роднай прыроды, яе прыгажосці. Максім Танк – пясняр беларускіх краявідаў, чуйны і спагадлівы сын прыроды, яе заступнік. Дзякуючы вершам паэта мы можам адчуць і зразумець мову ручая і дажджу, травы і дрэва, сонца і зорнага неба.

Паэт абараняў родную мову, культуру, гістарычную спадчыну ад забыцця, заняпаду, людской абыякавасці. Яго вершы пра беларускую мову многія людзі ведаюць на памяць.

Але, бадай, самай галоўнай тэмай, якая прайшла праз усю творчасць аўтара, стала чалавечнасць – дабрыня, справядлівасць, шчырасць, разуменне шчасця. Ягоныя словы могуць стаць сапраўдным дэвізам па жыцці: «Без чалавечнасці не будзе вечнасці».




<u>Група 2. </u>Прачытайце ўрыўкі з твора Алены Васілевіч «Сябры». Падмацуйце прыкладамі з тэксту пропускі ў ментальнай карце. Пры дапамозе ментальнай карты стварыце звязны тэкст.






*Ментальная карта расшыфроўваецца па гадзіннікавай стрэлцы. Чырвонай стрэлкай адзначана тое, з чаго трэба пачынаць.*

## IV. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія

***Задачы:*** ацаніць эфектыўнасць узаемадзеяння ўдзельнікаў майстар-класа; вызначыць магчымасць выкарыстання атрыманых ведаў, уменняў ў далейшай педагагічнай дзейнасці.

**Зварот да прыёму «Інсерт».** Ці засталіся ў вас пытанні пасля практычнай часткі? Ці можна, абапіраючыся на ментальную карту, стварыць звязны тэкст?

***Праца ў групах.*** Прачытайце сцверджанні, выберыце тыя, якія можна суаднесці з ментальнай картай.

<u>Група 1</u>

- ✓ Развіваюць маналагічнае маўленне.
- ✓ Паляпшаюць працэс запамінання.
- ✓ Развіваюць пазнавальную актыўнасць.

<u>Група 2</u>

- ✓ Развіваюць творчыя здольнасці.
- ✓ Спрыяюць адсутнасці пачуцця страху пры адказе.
- ✓ Эканомяць час.

**Майстар.** Тэкст, як пазл. Дзеці, збіраючы пазл, звяртаюць увагу на падказкі ў выглядзе формы элементаў пазла. Тэкст – гэта такі ж самы пазл. А ментальная карта – гэта тыя ж самыя падказкі, каб вучні маглі стварыць звязнае выказванне. Ці спраўдзіліся вашы чаканні? Чаму?